Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Цана асобнага нумару 20 грош.

БЕЛАРУСКАЯ ДОЛЯ

Выходзіць тры разы ў тыдзень.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул. 12, п. 6.** (Wileńska 12, m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад **12** да **2** г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад **9** да **3** г.

Падпіска на **адзін месяц** з дастаўкай да хаты **2 зл.** Для заграніцы ўдвая даражэй.

Перамена адрэса 30 грошы.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукована га залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 гр., за радок пэтыту ў 1 шп

№ 28. Вільня, Нядзеля, 26-га красавіка 1925 г. Год I.

№ 27 „Беларускае Долі" сканфіскаваны Камісарам Ураду на м. Вільню за артыкулы: „Рашучы выбар". „Водгукі катаваньня вучняў Віленскае Беларускае Гімназіі" і „Закон 7/I—25 г. аб школьніцтве на мясцох".

Перад каапэратыуным зьездам.

Барацьба за каапэрацыю ў Заходняй Беларусі даходзе да свайго лягічнага канца.

Калі—гадоў пяць-шэсьць назад—у Вільні распачаў сваю карысную працу Саюз Каапэратываў, ён—зусім натуральна — меў характар нацыянальна-беларускі.

Кажам: зусім натуральна, бо ж блізу ўсе каапэратывы, якія злучыліся ў Саюз, гурталі беларускае сялянства, шукаўшае ў каапэрацыі выхаду з тагачаснага цяжкога гаспадарчага стану. Дык натуральна, што Саюз павінен быў датарнавацца да нацыянальнага аблічча ўсяе масы сяброў каапэратываў, што мусіў мець інструктароў і працаўнікоў—беларусаў, ведаючых мову абсалютнае большасьці сяброў і блізкіх да апошніх духова.

Апе тое, што зьявілася вынікам нацыянальнага складу Заходняе Беларусі, было абвешчана польскімі каапэратарамі „нацыяналізмам", нязгодным з ідэяй каапэрацыі. Паводле іх думкі, *беларускай* каапэрацыі быць не павінна: наадварот, каапэрацыя пойдзе правільным шляхам, калі... першую скрыпку ў ёй будуць іграць палякі!

Тут гожа адзначыць, што ў тыя часы, калі ў Саюзе непадзельна панавалі беларусы, яны далі дужа яркі доказ поўнае *адсутнасьці нацыяналізму*: маючы магчымасьць выбіраць у кіраўнічыя органы Саюзу выключна беларусаў, яны стаялі іменна на становішчы шырока-краёвым і давалі заўсёды месца прадстаўніком палякоў, літвіноў, жыдоў...

Ад часу аслаўленага „Zarządu Cywilnego Ziem Wschodnich" і так-званае „Сярэдняе Літвы" мы бачылі запраўдны паход проці беларускасьці Саюзу як з боку польскіх каапэратараў, так і ўлады. Пазбаўляючы Саюз крэдытаў, стаўляючы яму розныя перашкоды ў працы яго на вёсцы, тагачасныя паны палажэньня выразна давалі зразумець, што пры зьмене нацыянальнае ахварбоўкі Саюзу зьменяцца і адносіны да яго з боку ўлады.

Гэта папхнула некаторых лёгкаверных беларусаў да зусім неабснованых і недастойных кампрамісаў з „пануючай нацыяй". З прадстаўнікамі польскае каапэрацыі была імі зроблена ўмова аб аддачы галоўных становішч у Саюзе паляком, але з забясьпечаньнем мейсца і беларусам. Аднак, другая старана ўмовы ня выпаўніла, і Управа Саюзу апынулася ў чыста польскіх руках.

Чысьленыя пратэсты сялянскіх беларускіх каапэратываў, ведама, ні да чога не давялі. Ім усьцяж заяўлялі, што інакш Саюз прападзе, бо польскія банкі не дадуць яму крэдытаў.

Дый гэта праўда. Але праўда і нешта другое: іменна, тыя, што пужалі беларусаў гібельлю Саюзу, самі зусім выразна вялі і вядуць яго да зьнішчэньня.

2-га мая с. г. разыграецца апошні акт барацьбы за Саюз. Сучаснае польскае кіраўніцтва пастанавіла аканчальна зьніштожыць Саюз, як самастойную арганізацыю, і зьліць яго з польскім каапэратыўным саюзам „Społem". Зьезд дэлегатаў ад каапэратываў і павінен зацьвярдзіць гэты сьмяротны прысуд самастойнасьці Саюзу.

З вялікім сумам углядаемся мы на гэтую пагібель беларускае эканамічнае арганізацыі, якае злучае і абслугоўвае шырокія масы нашага сялянства. І родзіцца пытаньне, адказ на якое, на жаль, наперад вядомы: няўжо-ж беларускія каапэратары так і здадуць свае пазіцыі бяз бою,—няўжож дапусьцяць да таго, каб іх Саюзам кіравалі адгэтуль не яны самі, а варшаўскія верхаводы?

Бязумоўна, пры сучаснай беднасьці нашага сялянства, пры адсутнасьці беларускіх крэдытных установаў (банкаў) і адмове крэдыту для беларусаў у польскіх банках—інакш і быць ня можа. І нашаму арганізованаму грамадзянству трэба вельмі паважна падумаць над *шырокай арганізацыяй эканамічна-фінансавай самаабароны і самадзейнасьці*, без якое мы заўсёды будзем *залежнымі ад чужых*.

Вясковыя каапэратары! Споўніце ваш грамадзкі абавязак, пашліце, скольки магчыма, дэлегатаў на зьезд Віленскага Саюзу Каапэратываў і бараніце самастойнасьць вашага Саюзу!

Аб чым пішуць.

Аб чым ведае і аб чым ня ведае газэта „Jutro".

(у справе „гонару" п. п. Валэйшы, Кабычкіна і інш.).

Газэта „Jutro" расказывае, як баранілі свой „гонар" паны Валэйша і Кабычкін—на судзе ў Варшаве, да якога яны пазвалі рэдактара гэтай газэты.

У свой час мы далі нашым чытачом пераклад гэтага артыкулу з газэты „Jutro" пад загалоўкам: „хто прадстаўляе беларускую апінію" (голас белар. грамадзянства). Артыкул быў напісаны з прычыны прыняцьця прэм. Грабскім „беларускай дэлегацыі", зложанай з сяброў віленскага „Беларускага (?) Грамадзянскага Сабраньня" (vulgo валэйшаўскай шулерні). Два сябры дэлегацыі абурыліся на гэты артыкул і падалі ў суд за „дыффамацыю", гэта значыць: не за падачу фальшывых **фактаў** аб іх, але за абражаючыя іх „гонар" **словы**.

Дый было-ж за што абурацца — ня толькі п. п. Валэйшы і Кабычкіну, але і ўсім іншым сябрам „дэлегацыі": п. п. Більдзюкевічу, палк. (?) Канапацкаму, самазваннаму „доктару" Павлюкевічу і з'ц-рэдактару Салаўю! Але чамусь бараніць свой „гонар" узяліся толькі п. п. Валэйша і Кабычкін. Нават п. „палкоўнік" пакінуў без абароны „честь мундира", дый усе іншыя толькі абцерлі сьліну з твару і аблізаліся....

Аб п. Валэйшы пісала „Jutro", што ён „служыў сьпярша беларусам, пасьля бальшавіком, літвіном, а цяпер паляком—за грошы", што „ў 1922 г. быў арыштаваны за дзейльнасьць антыпаньствовую (?), а пасьля быў выпушчаны дэфэнзывай за **ведамыя аказаныя ім услугі**", што „цяпер Валэйша стабілізаваўся нарэшце ў шулерскім прытоне, які ўтрымлівае і дзе „абрабляе" полёнафільскую апінію".

Можна закінуць гэтаму „фармуляру п. Валэйшы вялікія недахваты (больш падробна ведае аб ім яго прыяцель Обст!), але і гэтага аж зашмат, каб зьвярнуцца да судовай абароны.

Прап. Кабычкіна пісалася, што ён, былы агентвывядоўца арміі Врангеля, служыў таксама ў польскай палітычнай дэфэнзыве; быў арыштаваны ў 1922 г., але зараз-жа звольнены з вастрогу, каб... таксама прадстаўляць перад польскім урадам голас беларускага народу.

І тут, здаецца, даволі ня толькі са слоў, але і фактаў.

„Як відаць з вышэйпаданага,—піша цяпер „Jutro", мы зрабілі п. п. Валэйшы і Кабычкіну вельмі цяжкія закіны. Зрабілі мы гэта з поўнай сьвядомасьцю. Здаючы сабе справу з гэтага, мы панясьлі як угалоўную, таксама і маральную адказнасьць, калі-б хаця адзін з гэтых закідаў быў беспадстаўны".

І вось, рэдактар „Jutra" атрымаў павестку ў суд.

„З здавальненьнем чакалі мы судовай расправы, піша ён,—каб хаця пры гэтай нагодзе ахарактэрызаваць санацыйную акцыю (!) на ўсходніх „Крэсах".

Але... але паны Валэйша і Кабычкін — не зьявіліся на суд, да якога пазвалі рэдактара „Jutra"!..

„Відаць, ім быў патрэбны толькі гэты ганаровы жэст перад ашуківанымі беларусамі"...

„Не займаліся б мы (і мы ж таксама! — Рэд.) гэтай справай—гэткіх дыскваліфікаваных тыпаў,—стольki „plugawstwa" круціцца цяпер на сьвеце!.. Нам йшло аб урад п. Грабскага, які прымае дэлегацыю, складзеную з падобных крэатур, і радзіцца з ёю ў справе аздараўленьня (о іронія!) польска-беларускіх адносінаў... Калі нават п. прэм'ер быў ашуканы, дык пасьля апублікаваньня „фармуляраў" (personalji) сяброў дэлегацыі ён быў павінен зрабіць расследаваньне і пацягнуць да адказнасьці, як тыя ўрадовыя ўстановы, якія далі даз вол на адкрыцьце прытону, таксама і тых, хто з гэтым прытонам падтрымлівае кантак-асабісты і палітычны.

Дзіўна, як мала ведае сталічная газэта аб нашых крэсавых „stosunkach"!..

Ня толькі ня ведае яна дакладнага фармуляру ўсіх гэтых сяброў „дэлегацыі". Ня ведае яна, што гэтыя „дыскваліфікованыя тыпы" ня толькі „канфэруюць" з міністрамі і прэм'ерам, але разам з п. куратарам Гонсёровскім выдаюць кваліфікацыі навуковыя (!) і маральныя (!) кандыдатам на пасады беларускіх вучыцялёў.. Ня ведае яна, што гэтыя „тыпы" ня толькі „абрабляюць" апінію беларускага грамадзянства для ўраду—на экспорт у Варшаву і далей, але абрабляюць і апінію польскага ўраду аб шануючых сябе дзеячах беларускага грамадзянства.

Ня ведама Рэдакцыі „Jutra" і тое, што гэтую шулерню, падтрымліваную ўладай, фактычна **зачыніла, ці забіла само беларускае грамадзянства**, якое дзеля гэтага, пасьля „расколу" між п. п. Валэйшай і Павлюкевічам, пайшло на агульны сход „Сабраньня", зрабіла перавыбары яго ўраду, ды выкінула Валэйшу і яго кумпанаў, каб зараз жа зьліквідаваць усю гэтую ганебнай памяці „ўстанову".

І вось, як толькі сталася гэта і як толькі аб гэтым даведалася мясцовая вышэйшая ўлада, — дык толькі тады—запраўды-ж post factum — пасьпяшыла яна (дый і як яшчэ пасьпяшыла!) фармальна зачыніць былую шулерню—якраз у той мамэнт, калі яна перастала быць шулерняй—картавай і палітычнай...

Грамадзянін.

Вядомы францускі пісьменьнік Роні Старэйшы напісаў па асобаму заказу рэдакцыі газ. „Kur. Warsz." артыкул, у якім, паміж іншых, зьмешчаны гэткія, вельмі характэрныя для адносінаў Францыі да Польшчы, „кампліменты":

„У-ва ўсіх абставінах Польшча заўсёды высоўвала на першае мейсца **свой абавязак** адносна да Францыі (!)... Мы ня ведаем сымпатыі, адноль кава **вернай** і моцай, як—Польшчы да Францыі"...

„На выпадак вайны з Нямеччынай мы можам рахаваць на падтрыманые 30 міліёнаў палякоў" (?!).

„Апрача таго і матэрыяльнае багацьце Польшчы ўсё расьце... **Дык гэты народ здольны весьці вялікую вайну**"...

Трэба быць фрацузам, каб з такой клясычна-францускай яснасьцю і з такім клясычна францускім эгаізмам выразіць запраўдны зьмест адносінаў францускага сюзэрэна (магната) да польскага васала (падпанка)...

Цікава і гэтае „ўяўленьне" думкі аб новай „вялікай вайне", да якой рыхтуюцца абодва галоўных рыцары жэнеўскага мірнага „пратаколу"..

Аб беларускай інтэлігенцыі

(*адрывак з Мэмарыялу „Віленскага Бюро Палітычнай Працы*).

У часопісі „Przegląd Wileński“ зьмешчаны адрывак з Мэмарыялу, пададзенаго групай віленскіх краёвых палякоў-дэмакратаў, згуртаваных у т. зв. „Biuro Prac Politycznych“. Падаем з гэтага адрыўку найцікаўнейшае.

„Аднэй з галоўных прычын няўдачы польскай „państwowości“ на Усходніх абшарах зьяўляецца доктрына (моцна ўбітая ў галаву думка, ці ня крытычная тэорыя), якая не прызнае асаблівасьцяў гэтых абшараў і іх розьніцаў з землямі чыста польскімі, дый ня прыймае пад увагу асаблівых патрэбаў іх інапляменнага насяленьня.

„Добра ведамы ўсім „акляпаныя“ гутаркі аб недахваце нацыянальнай і палітычнай сьвядомасьці ў „тутэйшых“ масаў, якія (быццам) ня выходзяць па-за межы найпрымітыўнейшых (найпрасьцейшых) праяваў пляменнага пачуцьця і сувязі з гэтай зямлёй, і—аб быццам штучным буджэньні гэтай сьвядомасьці кучкай агітатараў, якіх звычайна падазраваюць у варожай (да Польшчы) дзеяльнасьці—пад уплывам Бэрліну ці Масквы.

На гэтай (быццам) штучнай агітацыі, на нязначнай колькасьці інтэлігенцыі ў беларусаў, на пасыўнасьці (?) масаў і будуецца ведамая добра праграма асыміляцыі гэтых зямель—спольшчаньня іх насяленьня—шляхам душэньня ўсялякіх праяваў самастойнага нацыянальнага жыцьця гэтага пляменьня (народу?!) і накіданьня гэтаму жыцьцю польскіх форм...

Гэтая сьляпая нацыяналістычная дактрына,—кажуць аўтары Мэмарыялу, —ня ведае фізычнага закону, які мае сілу і ў псыхічным сьвеце, што кожная дзейнасьць выклікае ўраз-жа роўнай сілы проці-дзейнасьць.

Дык за гэтую будзячую і агітуючую масу — лепш за ўсялякіх агітатараў—нацыяналістычную работу палякоў можна з пункту гледжаньня ўзросту і паглыбеньня нацыянальнай сьвядомасьці — толькі падзякаваць... — Як гэта ні дзіўна, але запраўды—прымус, уціск, гвалт над духам — толькі вызваляюць, толькі ўзмацняюць, толькі гартуюць яго... А перадусім — нацыяналістычны прымус і гвалт будзіць зо-сну сілу пачуцьця сваей нацыянальнай асаблівасьці ў народзе...

„Дык вось тут заўсёды пераацэніваюць значэньне гэтай пасыўнасьці масаў; але з другога боку—недаацэніваюць сілы гэтай нязначнай і нячысьленай інтэлігенцыі. Душой грамадзянстваў і выражэньнем іх імкненьняў заўсёды зьяўляецца інтэлігенцыя—незалежна ад багацьця духоўных ці фізычных сілаў, якімі яна багата. Незалежна ад ступені сьвядомасьці і культуры масаў, інтэлігенцыя гэтая заўсёды знойдзе шлях і спосаб, каб дайсьці словам да душы і патрэбаў таўпы і выкарыстаць яе прыспаную энэргію дзеля сваіх (?) мэтаў, часта адчуваных народнай масай паўсьвядома-туманна-пачуцьцём...

„Дык патрэбаў гэтай інтэлігенцыі ня можна лёгкаважыць, бо—ня гледзячы на „пасыўнасьць“ масаў—у рэзультаце гэтыя патрэбы інтэлігенцыі зьяўляюцца маторам—пхаючай уперад сілай грамадзянстваў, хоць-бы яны стаялі нават на першабытным роўні разьвіцьця“.

„А ў нас духоўныя і культурныя патрэбы — як беларускай інтэлігенцыі, таксама і беларускіх народных масаў—зусім і перадусім ігнаруюцца.

Ня істнуе амаль ня зусім—з прычыны перашкодаў з боку дзяржаўнай улады — беларускае пачатковае школьніцтва і — няма магчымасьці разьвіцьця яго—з прычыны адсутнасьці вучыцельскай сэмінарыі.

З найстрашнейшымі труднасьцямі, граічучымі з убожствам, змагаецца беларуская сярэдняя школа, пазбаўленая права публічнасьці і права даць сваім гадунцам доступ у польскія ўнівэрсытэты.

Ня кажам ужо аб вышэйшай школе, ці хаця-б аб катэдрах беларусазнаўства ў польскіх унівэрсытэтах.

Нячувана плыткая і каротка-зрочная думка,—што, робячы немагчымым атрыманьне ў Польшчы сярэдняга і вышэйшага ўзгадаваньня ў нацыянальна-беларускіх формах,—тым самым будзе спынены ці прыпынены прырост беларускай інтэлігенцыі, ці будуць прымушаны беларусы ў Польшчы прыняць польскую культуру, — у рэзультаце дае тое, што імкненьне да асьветы ў беларускіх масах, хаця і з трудом, знойдзе выхад сярод ня толькі чужых, але і найбольш варожых нам (палякам) народаў“.—Бо-ж „беларуская моладзь едзе ў Прагу, дзе чэхаславацкі ўрад дае спэцыяльныя стыпэндыі для беларускіх студэнтаў, якія ў Польшчы ня могуць атрымаць вышэйшай асьветы; едзе ў Латвію, едзе ў Менск, дзе за кардонам паўстае „дзяржаўная Беларусь“ (чаму чужаслоў?), дзе беларуская школа акружана найбольш энэргічнай ахова з боку дзяржавы і стараецца узгадоўваць інтэлігенцыю ня толькі на свае ўласныя патрэбы, але перадусім—на экспорт (на вываз)—дзеля шырэньня лёзунгаў сацыяльнага перавароту і адарваньня Заходняй Беларусі ад Польшчы“...

„Эканамічныя лёзунгі (зямельны голад) зьліваюцца тутака з нацыянальнымі, творучы адзінае цэлае—пад уплывам інтэлігенцыі, патрэбы якой зусім зьняважаны, якую ў Польшчы зьвялі да ролі сталага безработцьця. зачыніўшы перад ёй усякія шляхі да дзяржаўнай і культурнай, а нават эканамічнай працы, якая сілаю рэчаў кінута ў масы—дзеля агітацыі — у гэтых варунках, ведама, некарысных для ўзмацаваньня ў ёй ляяльнасьці да Польскай дзяржавы“...

„Даволі сказаць, што, напрыклад, вучыцялі беларускіх гімназіяў змушаны дарабляць на жыцьцё—начной працай, як наборшчыкі“...

„Дык дзіва, **што сярод беларускай інтэлігенцыі амаль-што няма зусім людзей з польскай орыентацыяй.** Тыя, што асталіся, як яны кажуць,—„вернымі заходняй орыентацыі“, ня могучы пагадзіцца з бальшавізмам,—страцілі ўсялякую веру ў магчымасьць дайсьці да паразуменьня з Польшчай. **Няма цяпер ужо аніводнай палітычнай партыі, якая-б бачыла будучыну свайго народу, апіраючыся на Польшчу.**

(Слухайце, пане „доктар“ Павлюкевіч!).

„Дык і ня будзем пацяшаць сябе тым, што масы беларускія—пасыўныя і несьвядомыя. Глухі гоман нездаваленьня шырыцца ўсё моцней...

Труднасьць барацьбы з бандытызмам ляжыць у значнай меры ў антыпольскіх і антыдзяржаўных настроях масаў. А што гэтая нячысьленая інтэлігенцыя ўмее дайсьці да душы гэтых быццам пасыўных масаў, сьведчаць аб гэтым рэзультаты выбараў у Сойм, якія ў будучыні дадуць нам (паляком) яшчэ больш пераконываючыя довады“...

Усе гэтыя думкі высказаны і перасказаны беларускай прэсай тысячы разоў...

Патроху, відаць, разумнеюць польскія галовы беларускім розумам... Шкада толькі, што **розум** тых, што гэта ўсё зразумелі, ня мае ані крыхі **волі і ўлады**, каб зьдзейсьніць свае думкі. **Але** тыя, што маюць волю і ўладу — безнадзейна пазбаўлены... розуму!

Беларускі працэс у Латвіі.

(*Ад нашага карэспандэнта*).

Трэці дзень.

Трэці дзень быў самы важны і самы рашучы: разгляд істотных доказаў. Паказаньні сьведкаў не далі абвіненьню ніякага матэрыялу, і пракурору асталіся толькі матэрыяльныя доказы.

Першае абвінавачаньне было ў тым, што таварыства „Бацькаўшчына“ ў Латгаліі бярэ пачатак і атрымлівае дырэктывы ад менскае „Бацькаўшчыны“, дый што статут, паводле якога працуе латгальская „Бацькаўшчына“, быў быццам-то друкаваны ў Менску. Выхадзіла, быццам іменна латгальская „Бацькаўшчына“ і ёсьць тая „праступная арганізацыя“, якая пастанавіла адарваць ад Латвіі Латгалію—мусіць, каб далучыць яе да Менску, дзе друкаваўся статут. Але тут, паміма недаказанасьці гэткае думкі пракурора, выйшла йшчэ і такая пацеха: падсудны Езавітаў зьвярнуў увагу суда на тое, што статут быў надрукаваны ня ў Менску, як гэта прост **выдумаў** пракурор, а **ў Коўні, што надрукавана на самым-жа статуце**. Гэта зусім разьбіла першае абвіненьне.

Далей — пражская канфэрэнцыя, якая быццам-то арганізоўвала сілы дзеля такога адарваньня Латгаліі, ад якое выйшлі адпаведныя „праступныя“ дырэктывы. Абарона выясьніла, што ў рэзалюцыі культурнае сэкцыі канфэрэнцыі зьмешчана зусім проціляжнае!

Далей—карта Беларусі, выданая ў Вільні ў 1918 годзе, аб „праступнасьці якое гэтак многа гаворыцца ў працэсе. Выясьнілася, што карта была надрукавана задоўга да таго, як былі ўстаноўлены граніцы Латвійскае рэспублікі. Падобна-ж была разьбіта на судзе і „праступнасьць“ учэбніка геаграфіі А. Смоліча. Абарона прадставіла суду расейскі ўчэбнік геаграфіі Новоселова, надрукаваны ў Латвіі і дапушчаны міністэрствам асьветы ў-ва ўсе школы, дзе аб падзеле Беларусі гаворыцца тое самае, што і ў Смоліча, з тэй толькі розьніцай, што фраза Смоліча: „разрэзана па жывому целу“ заменена ў расейскім учэбніку проста словам „разрэзана“, а замест слоў „Латвія атрымала“ частку Беларусі сказана, што гэная частка „апынулася ў межах Латвіі“. Пры гэтым абаронцам прышлося даказываць, што слова „атрымала“ ня значыць парасейску „отторгла“, а „получила“.

Многа гаварылі на судзе і аб журнале „На Чужыне“, надрукаваным у Рызе. Дый ізноў аказалася, што ў ім нічога праступнага няма. Мала таго: тамака зьмешчана афіцыяльнае прывітаньне ад міністра заграпічных спраў Латвійскае рэспублікі на імя Езавітава, у якім міністар жадае працьвітаньня Беларускай рэспубліцы! Выходзіла, лягічна разважаючы, што і міністра Мэеровіца трэба хіба пасадзіць на лаву падсудных—побач з Езавітавым....

Але цэнтральным пунктам абвіненьня былі ўзятыя пры вобыску ў Краскоўскага пісьмы Цьвікевіча і Крэчэўскага, у якіх ішла гутарка аб адзіным беларускім фронце: Вільня—Прага—Коўна—Дзьвінск—Амэрыка. Тут абвіненьне, здавалася, і знайшло ўрэшце гэную знамянітую тайную „праступную арганізацыю“, якога руліва шукаў пракурор і ня мог нідзе знайсьці. На гэтым пракурор галоўным чынам і пабудаваў сваю абвініцельную прамову, націскаючы перад усім на падсуднага Краскоўскага.

Прамова пракурора, паводле слоў саміх-жа рыжскіх адвакатаў, была мастацкая! Ня маючы ніякіх канкрэтных матэрыялаў, пракурор з гэтых немагчымых даных зрабіў нешта магчымае.

Сьпярша пракурор затрымаўся на паказаньнях сьведкі Оліншa. Стараючыся разьбіць гэтыя паказаньні, ён пачаў з характэрыстыкі падсудных, якія па сваей мінуўшчыне і па сваей грамадзкай працы зьяўляюцца ня проста нацыянальнымі культурнымі работнікамі, а выдатнымі палітычнымі дзеячамі. Езавітаў—былы прадстаўнік Беларускае Рэспублікі ў Рызе, арганізатар і камандзір палка беларускае арміі; Якубэцкі—б. камандуючы беларускае арміі; Краскоўскі, аб якім гэтак добра гаварыў Оліні,—б. старшыня віленскага Беларускага Нацыянальнага Камітэту, цэнтру палітычнага жыцьця Заходняе Беларусі. Пры гэтым пракурор ядавіта адзначыў, што, хаця тут шмат гаварылася аб заходнім кірунку палітыкі Краскоўскага, аднак. Польшча, якую ён быў прымушаны пакінуць,—гэта-ж Захад..

Спрытна зьвязываючы пасрэдныя ўлікі, асьцярожна абыходзячы небясьпечныя мамэнты, якіх для абвіненьня было лішне многа, зваліваючы, як гэта пасьля выясьніла абарона, у адну кучу культурна-асьветную, нацыянальную і палітычную работу,—пракурор улажыў прамову, якая зрабіла сільнае ўражаньне. І вагі Тэміды як-быццам пачалі скланяцца ў бок абвінавачаньня....

Але тут выступіла абарона, і абраз зразу зьмяніўся.

Абарона.

З абароны першы прамаўляў дэпутат латвійскага Сойму і былы міністар справядлівасьці Гольцман. У бліскучай, разумна-лягічнай, натхнёнай прамове Гольцман, як палітык-мастак, знамяніта нарысаваў палітычны бок працэсу ў-ва ўсей яго глыбіні. Ці з пункту гледжаньня латвійскае палітыкі ідэя незалежнай Беларусі—праступная?—Не! Ня толькі не праступная, але яе трэба вітаць. А пытаньне аб граніцах, калі незалежная Беларусь будзе істнаваць, вырашыцца мірна і дружна. У працягу дзьвюх гадзін Гольцман зусім разьбіў усе абвінавачаньні пракурора—перад усім у адносінах да Езавітава і Іванова (якіх ён бараніў), дый адносна да агульных падставаў абвіненьня.

Пасьля яго выступіў адвакат Шмідт. Ён пачаў з пытаньня: хто сядзіць на лаве абвінавачаных? Сядзяць тыя, што горача любяць свой народ і аддаюць сябе дзеля працы“ для яго. Яны лятуцелі аб поўным нацыянальным адраджэньні свайго народу. Перад іх стомленым духовым зрокам паўставала, як міраж, як фата-моргана, прыгожае лятуценьне—ідэя дзяржаўнае незалежнасьці іх народу, падтрымліваўшая іх у цяжкай вандроўцы ў пустынях буднае нацыянальнае работы.—Хораша, з вялікім пад'ёмам гаворыць Шмідт аб сьвятасьці і велічы пачуцьця любві да бацькаўшчыны, аб нацыянальнай дзеяльнасьці бароненых ім Краскоўскага, Пігулеўскага, Мядзёлкі, Якубецкага, ды таксама і Езавітава і Іванова, уся віна каторых толькі ў тым, што яны — „вялікія патрыоты“. Далей ён вельмі тонка і лягічна разьбівае тасаваньне да падсудных арт. 102 і ў жывой, абразовай форме шукае гэнае неўлавімае „праступнае арганізацыі“, аб якой так многа, але так туманна гаварыў пракурор. Разгледзіўшы матэрыяльныя доказы абвіненьня, ён лягічна даходзе да яснага вываду, што ні аб якой „праступнай арганізацыі“ ня можа быць і гутаркі.

Трэцім выступіў дзьвінскі адвакам Будоўскі. Дзелавіта, спакойна і пераконываюча разглядаў ён абвінавачаньне пракурора, умела і вельмі разумна карыстаючыся паказаньнямі сьведкаў. Сваю стройна-даказальную прамову Будоўскі заканчывае заявай, што іменна гэтая любоў да свайго народу, за якую судзяць яго падсудных (тых, аб якіх гаворыць і Шмідт),—іменна яна і прадстаўляе той непарушны фундамант, на каторым будуецца магутны гмах кожнае дзяржаўнасьці, у тым ліку і Латвійскае.

Пасьля магутнага і сьветлага ўражаньня ад гэтых трох прамоваў, выслуханых усімі з захапляючым зацікаўленьнем, нейкім прыкрым дысанансам здалася жаласьлівая прамова чацьвертага абаронцы, які бараніў „прыпадковага“ падсуднага Жэрдія. Адвакат гэтага падсуднага, пазываючыся на паказаньні сьведкаў Жэрдія, даводзіў (— гэта была бясспрэчная праўда), што падсудны Жэрдій ня мае нічога супольнага з рэштай абвінавачаных, што недалучыўся да беларускага руху выключна, як безработны інтэлігент, што прыехаў не з Літвы, як другія, а з Масквы,—інтэлігент, незнаёмы з дзяржаўнай латвійскай мовай, – далучыўся ня ў імя ідэі, а выключна дзеля куска хлеба. У вачах суда і публікі фігура Жэрдія была правільна прадстаўлена, як нешта гадкабязыдэйнае, нікчэмнае.

Апошняе слова падсудных.

Першы прамаўляў падсудны Езавітаў, які каля году прасядзеў у вастрозе, чакаючы суда. Вось яго словы:

„Грамадзяне Судзьдзі, мне дужа цяжка апраўдацца „на—істоце“, созводімых на меня гр. Пракурорам абвінавачаньняў, бо ніякае „*істоты*“ ў іх няма.

— Слухі, плёткі і згадкі.

Цяжка, ды і няўдзячная задача, ваяваць супраць плётак і чутак.

І я ваяваць з імі ня зьбіраюсь.

Не хачу я спыняцца таксама: на тых няточнась-

цях сэнсу паказаньняў, а таксама і перакручываньнях зьместу кніжак і лістоў, якія робіць следавацель і паўторываў іх Пракурор.

Гэтыя неправідловасьці высьвятлілі сьведкі і абарона.

Мне хочацца падкрэсьліць толькі тое, што і ў апошняй сваей прамове, гутарцы аб маім пабачаньні з Міністрам Унутраных Спраў, у справе зьняцьця канфіскаты з штомесячніка „На чужыне“, гр. Пракурор, хаця-ж і дужа мастацкі, але зусім ня згодна з справай, перадаў маю гутарку з гр. Бэргам.

Ніякіх абяцаньняў „не пашыраць больш ніколі“ на Латвійскай тэрыторыі гэтага штомесячніка я не даваў.

Аб гэтым ня было і гутаркі.

Гэты діалёг — вынік творчае фантазіі гр. Пракурора.

Канфіскацыя, як гэта відаць і з тэксту прыказу міністра, зьнята бяз ніякіх умоў.

З паказаньняў сьведак і з маей перапіскі з сябрамі суд можа пераканаўся і ў тым, што я ня толькі заўсёды быў лёйяльны, але і шчыра прыязны да Латвіі.

Гэта прыязьнь праяўлялася ня толькі ў працы маей на Латвійскае тэрыторыі, але і пры выездах за межы, дзе гэтак спакусна выліць усё тое, што „накіпае“ на душы.

Ня было скаргаў, а знача і „не накіпала“.

Адзываючыся аб Латвіі, да гэтага часу, мы выказвалі ёй толькі прыязьнь і ўзьдзяку.

Па думцы Пракурора, гэта „маска“.

„Хітрая гульня“!

„Мы, беларусы,—прыкідаемося“!

Хай так!

Аднак, гр. Пракурор не здалеў зьняць нашае „маскі“!

І хай ня турбуецца.

Гэта ня маска, а запраўдны наш твар.

Я катэгарычна адкідаю ўзвадзімыя на мяне абвінавачваньні.

Я пераканаiы ў перамозе Разума.

Дзесяць доўгіх месяцаў адзіночнага заключэньня я спакойна чакаў сёньняшняга дня, і моцна веру, што сёньня мая пакута будзе скончана“.

Пасьля Езавітава ўзяў слова падсудны **Пігулеўскі**. Падробна разабраўшыся ў перапісцы з Цьвікевічам, ён давёў няправільнасьць пракурорскага абвінавачаньня і закончыў прамову выражэньнем надзеі, што праўда пераможа, і ён будзе судом апраўданы.

Якубэцкі дакумэнтальна даводзіць, што Геаграфія Беларусі выкладалася ў Гімназіі зусім легальна—на падставе загаду ўлады. Апавядае гісторыю адказу на пісьмо Цьвікевіча і, адзначаючы сваю поўную нявіннасьць у ўзьведзеных на яго праступках, просіць аб апраўданьні яго.

Мядзёлка-Грыб зьявілася на суд зусім хворая і з гэтае прычыны ад слова адмовілася.

Даўжэйшую прамову сказаў падсудны **Краскоўскі**:

„Працуючы ўжо многа гадоў дзеля нацыянальнага адраджэньня ў гэтай агульнай барацьбе за нацыянальнае вызваленьне ўсіх народаў, мне ня раз даводзілася сустракацца з прадстаўнікамі латышскага нацыянальнага адраджэньня. Апошні раз на Кіеўскім зьезьдзе народаў я быў, як беларус, у радзе зьезду разам з прадстаўніком латвійскага народу, цяпер дзеяльным дэпутатам латвійскага Сойму.

Узгадованныя на заходніх ідэалах, ідэалах шырокага і ўсебаковага аболюцыянізму і дэмакратызму, мы, беларускія нацыянальныя работнікі, шчыра йшлі поруч з другімі народамі, змагаючыся за нацыянальнае вызваленьне з былое вялікае „турмы народаў“.

Палітыка Польшчы ня зьдзейсьніла спадзяваньняў тых беларусаў, якія змагаючыся некалі поплеч з Польшчай „за вашу і нашу волю“, маніліся і пасьля сусьветнае вайны працаваць разам у дзеле нацыянальнага вызваленьня.

Апрача Польшчы, на Захадзе на руінах Расейске імпэрыі ўтварыліся новыя дэмакратычныя рэспублікі тых народаў — літвіноў, латышоў і др., з якімі за апошнія дзесяткі гадоў беларусы разам працавалі дзеля нацыянальнага адраджэньня,—разам пакутавалі, разам лятуцелі. І калі больш шчасьлівым народам — літоўскаму і латышскаму — удалося зьдзейсьніць старыя нацыянальныя лятуценьні,—нам, што разам з імі лятуцелі, здавалася натуральным і працаваць разам. І вось, як толькі ў Латвіі выявілася магчымасьць беларускае нацыянальнае працы, гэта ў беларускіх грамадзкіх колах было спаткана з радасьцяй, былі згуртаваны нацыянальныя сілы, і распачалася ў Латвіі работа дзеля нашага культурна нацыянальнага адраджэньня. Вось, дзеля чаго мы йшлі рука ў руку з латышскім грамадзянствам—ня ў імя выслугоўваньня ці мелкага кар'ерызму, але ў імя супольных нацыянальных ідэалаў і дзеля нацыянальнага адраджэньня роднага беларускага народу ў Латвіі, аб якім з гэткай пагардай гаворыць успомнены тут, на судзе, расейскі вучэбнік геаграфіі, як аб народзе самым малакультурным і бедным. Вось, чаму мы і не стаўлялі сабе ніякіх шырокіх палітычных мэтаў, а ўзяліся толькі за самыя скромныя, але і самыя важныя заданьні: перад усім — прасьвятленьне нашага цёмнага народу сьвятлом яго роднай нацыянальнай культуры, справа яго культурна-нацыянальнага адраджэньня; другое-ж важнае нашае заданьне—эканамічнае адраджэньне народу, але дзеля гэтага ў нас яшчэ ня было даволі сіл і часу.

Гэтак, будучы вернымі сынамі роднага беларускага народу, служачы ягоным інтарэсам, якія поўнасьцю сыходзіліся з інтарэсамі Латвіі,—мы чэсна і дружна йшлі поруч з латышскім народам, — і вось чаму ў гэтым працэсе няма і ня можа быць ніякіх даных аб нашай „здрадзе“, аб дзеяльнасьці проці Латвіі. І мы былі чэснымі ў сваей рабоце ня толькі ў імя чэснасьці самой па сабе, an sich, але і ў імя нашых супольных інтарэсаў з Латвіяй, трымаючыся мудрага правіла практычных англійцаў: honesly is the best poliky — чэснасьць—найлепшая палітыка. Дзеля гэтага мы і ўзгадоўвалі, як гэта выясьнілася на судзе, нашу моладзь у пачуцьцях сымпатыі беларусаў да латышоў і ўдзячнасьці Латвіі за яе апеку над нацыянальным адраджэньнем беларусаў у Латвійскай рэспубліцы,—і гэта ня толькі ў урачыстых прамовах—pro publico, але і ў штодзенным школьным жыцьці. Здавалася, што тутака нам удалося—зьдзейсьніць нашыя старыя лятуценьні, але... але пачаўся і ў Латвіі беларускі працэс.

Але я веру, цьвёрда веру, што гэтая часіна цяжкіх спроб для нашае нацыянальнае справы мінецца, што разыйдуцца хмары, засьвеціць сонца праўды і пры яго яркім сьвятле ўсім будзе ясна, што мы чэсна йшлі, і што ня было ў нас няпраўды і... віны“.

Яшчэ двойчы выступаў з рэплікамі пракурор, але ўсе яны былі разьбіты абаронай. Гэта была цікавая дуэль на словах, якая закончылася перамогай абароны.—„Гэта была прыгожая песьня“—сказаў быццам сам пракурор пасьля суда аб беларускім працэсе.

Як ужо ведама, суд апраўдаў усіх падсудных. Апраўдана гэтым і ўся беларуская праца ў Латвіі, узятая пад падазрэньне. Але раны, зробленыя беларускай справе гэтым працэсам, нязвычайна цяжкія, і патрэба многа часу і працы, каб іх залячыць.

В. С.

Важнейшыя здарэньні.

У Польшчы.

Праект скасаваньня Наваградзкага ваяводзтва.

У сувязі з урадовым праектам новага адміністрацыйнага падзелу „Усходніх зямель“ Польшчы мае быць скасавана зусім самастойнае Наваградзкае ваяводзтва.

Хто-ж такі Мурашка?

„Kur. Por.“ дае новыя весткі аб тым, хто такі Мурашка, — праваслаўны і сын былога чыноўніка расейскай царскай ахраны. У адраджонай Польшчы быў сьпярша афіцэрам жандармэрыі—у Латгаліі, дзе латышы скардзіліся на яго нялюдзкае зьверства, у 1920 г. ажаніўся з нейкай расейскай „графіняй Апраксінай“, якую падазравалі і як бальшавічку, і як манархістку. У 1920 г. Мурашка пакінуў жонку на расейскім баку, дзеля чаго яго падазравалі ў зносінах з ёй — з мэтай шпіёнства.

Газэта піша, што нейкія дзіўныя ніці вяжуць Мурашку з працэсам Вечоркевіча і Багіньскага.

Абшарніцкае „Słowo“ ў Вільні зьмясьціла фатаграфію гэтага „нацыянальнага героя“.

Безрабоцьце зьмяншаецца.

Паводле афіцыяльных даных, безрабоцьце ў Польшчы за тыдзэнь 28/III — 4/IV зьменшылася на 1.760 асоб і спынілася на лічбе 183.640.

Цыфра таксама немалая!..

А на нашых „Крэсах“ безрабоцьце ўсё расьце.

Заграніцай.

Экспозэ прэм'ера Пэнлевэ.

Прэм'ер Пэнлевэ ў сваей першай праграмнай прамове ў парляманце заявіў, што першыя задачы ўраду — гэта... справа гарантаваньня бясьпечнасьці Францыі і адратаваньне яе фінансаў. Дзеля таго ўрад будзе кіравацца двумя прынцыпамі: утрыманьня міру на падставе істнуючых трактатаў (!) і раўнавагі гаспадарчай і фінансавай на падставе раўнамернай раскладкі падаткаў. Урад мае сумленна выпаўняць „плян Доўса“ і імкнуцца (!) да ўрэгуляваньня сваіх даўгоў, урад стаіць верна за жэнеўскі пратакол. Удачнае вырашэньне замежных задачаў дасьць магчымасьць краю зменшыць ваенныя выдаткі і цяжары (вось яно!), чаго трэбуе край. Дзеля падтрыманьня бюджэтнай раўнавагі ўрад ня будзе руйнаваць скарбу ані франка, але наложыць яшчэ цяжэйшыя, чым дагэтуль, падаткі, якія францускія грамадзяне, як патрыёты, павінны будуць плаціць. Урад абяцуе абмежаваньне выдаткаў. Абяцуе пакінуць... і прадстаўніка Францыі пры Ватыкане.

У дыскусіі цэлы рад аратараў апазіцыі крытыкаваў экспозэ прэм'ера, нападаючы перад усім на асобу Кайо, якога баранілі прэм'ер і Брыян.

У канцы гаварыў сам Кайо, але не аб сабе, а аб фінансах. Паводле яго слоў, фінансавыя труднасьці Францыі—вялізарныя. Аздараўленьне фінансаў — справа даўжэйшага часу. Пакуль што трэба толькі зраўнаважыць усімі спосабамі бюджэт і не чарпаць цераз меру з крыніцы Францускага банку, каб не зваліць франка. Бюджэт будзе прадстаўлены ўжо ў чэрвені.

Францускі парлямант 304 галасамі проці 218 выразіў даверые габінэту Пэнлевэ—пад варункам, што вышукае спосабы дзеля аздараўленьня фінансаў.

Кампанія проці Кайо.

Проці Кайо ў „нацыянальным абозе“ пачалася рашучая барацьба. Намечаны рад мітынгаў пратэсту, на якіх выступяць галоўныя лідэры блёку з Мільеранам і Пуанкарэ на чале.

Гэтая агітацыя ўжо дала плады. Каля парляманту арыштаваны нейкі падазроны суб'ект, які прызнаўся, што чакаў на праезд Кайо, каб яго забіць.

Разруха ў Баўгарыі.

Баўгарскае афіцыяльнае агенцтва паведамляе, што, паводле паказаньняў сьведкаў і арыштаваных, замах у саборы — дзела тэй самай арганізацыі, якая рабіла ўсе апошнія тэрарыстычныя акты. На чале яе стаяць афіцэры Янков і Мільцэв, шэфы камуністычнай ваеннай сэкцыі.

Замах быў зроблены пры ўчасьці (?) званара сабору, які згадзіўся пусьціць замахоўцаў на званьніцу—быццам дзеля зьняцьця фатаграфіі з жалобнай урачыстасьці. Заместа фатаграфічнага апарату была пастаўлена так-званая „пякельная машына“.

Замах быў уплянаваны на вялікі маштаб, каб адразу зьніштожыць увесь двор з каралём, урад і ўсё вышэйшае чынавенства.

Газэты пішуць, што ў сувязі з выбухам падаўся ў адстаўку прэм'ер Цанков. Яго наступнікам называюць Малінава.

Выкрыты паліцыяй пры вобысках быццам запраўдны спраўца замаху, нейкі Мінков, забіты пры арышце за спраціўленьне.

Сярод ахвяр выбуху—3 паслы, 13 генаралаў, 8 палкоўнікаў, 8 вышэйшых урадоўцаў, 2 адвакаты, 19 кабет і 7 дзяцей. Два „лёгка“ раненыя міністры памерлі.

У баўгарскім міністэрстве кажуць быццам замахоўцы нядаўна атрымалі праз Чорнае мора 4 мільёны залатых рублёў.

Рэвалюцыя ў Партугаліі.

Лісабонскія газэты пішуць, што ваенны пераварот зроблены (?) маёрам Камара, які—з помачай некалькіх сотняў пяхоты, кавалерыі і артылерыі—заарыштаваў рад вышэйшых прадстаўнікоў улады і стварыў новы ўрад.

Гэты ўрад аказаўся ў казармах, якія акружылі ўрадовыя войскі.

Дэпутат Сунха Леаль, які лічыцца правадыром рэвалюцыйнага руху, арыштаваны.

Паводле апошніх вестак, лісабонская рэвалюцыя зьліквідавана. Збунтаваныя афіцэры ўжо пасаджаны ў вастрог. Усе ваенныя часьці, захопленыя рухам, расфармаваны.

Замах на парахоўню ў Лібаве.

У ноч на 18/IV у Лібаве некалькі асоб зрабілі замах на ваенныя склады ў Лібаве. Варта агнём кулямётаў адбіла напад. Пагоня за замахоўцамі не дала рэзультатаў.

Высяленьне польскіх зямляўласьнікаў з Радавай Беларусі.

„Młot“ (менская газэта) піша, што да 1-га студзеня 1926 году маюць быць выселены з Беларускай Рэспублікі каля 600 сямей польскіх зямляўласьнікаў. У першую чаргу будуць высяляць 107 сямей, маючых зямлю ў пагранічным пасе.

Маркс аб „вялікай Нямеччыне“.

Рэспубліканскі кандыдат Маркс у вялікай выбарнай прамове ў Бэрліне заявіў, што цяпер—у часе перагавораў аб умове бясьпечнасьці—нямецкі народ высоўвае лёзунг „вялікай Нямеччыны“.

Далучэньне Аўстрыі—сталая думка Нямеччыны.

На ўгодках Бісмарка.

Апошняя вялікая прамова Чэмбэрлена зрабіла вялікае ўражаньне ў Нямеччыне. Як ведама, англійскі міністар, кіраўнік замежнай палітыкі, заявіў зусім выразна, што Англія верыць у добрую волю Нямеччыны і рашуча адмаўляецца ад усялякага аднабокага саюзу з Францыяй і Бэльгіяй, скіраванага проці Нямеччыны.

Выражэньне гэтаму здаваленьню даў мін. Штрэзэман у сваей прамове ў Хэмніцы на ўрачыстасьці ўгодкаў нарадзін Бісмарка.

Штрэзэман бачыць у гэтым павароце Англіі, зразумеўшай нямецкі народ і ў справе... усходніх граніцаў яго краю, — залог міру... Гэтыя граніцы будуць зьменены мірным шляхам,—казаў ён,—дзеля таго гэткая наша палітыка будзе, можа, непапулярная... Але хай народ нямецкі азброіцца цярплівасьцю і працуе, як і яго цяперашні ўрад, — на дабро будучых пакаленьняў...

Нямецкая прэса наагул здаволена поступам перагавораў. Немцы спадзяюцца, што ў працягу лета будзе ўжо склікана новая вялікая міжнародавая канфэрэнцыя („другая Лёзанская“!),—бо антанта (Англія!) хоча, каб Нямеччына да васеньняй сэсіі Лігі Народаў была ўжо яе сябрам...

Амэрыка і Гіндэнбург.

Нямецкія соймавыя кругі вельмі ўстрывожаны раптоўнай адмовай усіх амэрыканскіх банкаў даваць крэдыт Нямеччыне. Левая прэса тлумачыць гэта фінансавай рэпрэсіяй Амэрыкі проці небясьпечнай для Нямеччыны кандыдатуры Гіндэнбурга.

„Анархія ў Кітаі“.

Англійская газэта „Times“ піша, што ў Кітаі пануе вельмі небясьпечная анархія. Агульнага ўраду няма. Асобныя генаралы пануюць у сваіх правінцыях. Парлямант ня мае ніякага значэньня. Калі так пойдзе далей, дык (зразумела-ж!) дзяржавы павінны будуць умяшацца, і—пачнуцца канфлікты між дзяржавамі... „пры адбудове парадку“ (ці лепш: падзеле краю). Газэта англійскага імпэрыялізму прапануе ўраду—захапіць тамажні (мытніцы) і чыгункі, каб... спыніць гэтым хатнюю вайну ў Кітаі.

З навейшых твораў Янкі Купалы.

Ой, вяду бяду...

(З народнага).

Ой, вяду бяду, а бяда мяне
Водзіць вечным сьледам;
Гэтак ходзім мы за адным адно,
Як той дзед за дзедам.

Гэй, паклічу сход ды зьбяру народ,
Ды зьбяру жаўнераў,
Хай ідуць вайной на маю бяду —
На ліхога зьвера.

На мой кліч, на сход гмін народу йшло,
Шоў ваяк з ваякам, —
Кожны сьмел, ахвоч, б'е адвага з воч,
Поле ўслалі макам.

Як той лес, жаўнер да жаўнера стаў,
Зброя ў сонцы йграе;
Зварухнуўся полк, а за ім—другі,
Толькі сьцяг міргае.

Мах за крокам крок! войска йдзе ў паход,
Быццам тая хмура,
Аж дрыжыць зямля, як ваякі йдуць
Ды пяюць, як бура.

Гэй, выходзь, бяда, гэй выходзь, хто нам —
Непрыяцель — вораг!
Пачастуем так, што папомніш век,
Ды сатром на порах.

Знай, жаўнеры мы, выйшлі не на жарт
Біцца, ваяваці.
Знай хавалі нас поле, бор і лог
Беларусі — маці!

А у бары, у бары.

Янкі Купалы
(з народнага).

А ў бары, у бары *тры дарожанькі.*
Гэй, гэй, гэй, тры дарожанькі!
Тудой шоў жаўнер *наш прыгожанькі.*
Гэй. гэй, гэй, наш прыгожанскі!
Стаў, глядзіць жаўнер, *сумняваецца.*
Па якой пайсьці, *надумляецца.*
Па аднэй пайсьці—*не пашэньціцца.*
За вядзе на ўсход, *скуль ня вернецца.*
Па другой пайсьці—*абняволіцца.*
Бо ў заходні бок *шлях той коціцца.*
Выбіраў жаўнер *трэцьцю сьцежаньку.*
Бо вяла яна ў *родну межаньку.*
І запеў жаўнер *той прыгожанькі.*
А ў бары, ў бары *тры дарожанькі.*

Набранае курсівам паўтараецца двойчы.

З зборніку „Безназоўнае“.

ХРОНІКА.

Да аблавы на людзей у Наваградчыне. „Dz. Wil.“ падае падробнасьці аб тым, як зроблены былі аблавы „на дывэрсыйныя банды“ ў Наваградчыне. У палове лістапада паліцыя ў Наваградчыне напала на сьлед бальшавіцкай акцыі—у напрамку стварэньня на тэрыторыі ваяводзтва дывэрсыйных бандаў—дзеля нападаў, якія павінны былі ўзнавіцца на вясну. Калі ўсё было добра высачана, тады пад відам манэўраў былі сьцягнены на намечаныя абшары ваяводзтва вялікшыя атрады войска, якія разам з паліцыяй адначасна ў розных мясцох пачалі рабіць аблаву...

Аблава дала, як піша газэта, „надспадзяваныя рэзультаты“: знойдзена маса камуністычнае літэратуры, перапіска з Менскам, аружжа і г. д.

З усіх арыштаваных 360 затрыманы і перасланы ў Вільню—да пракурора.

Але пры чым-жа тут беларускія культурныя работнікі, вучыцялі і дэклярацыі аб беларускай школе?

„Аблава на камуністаў у Вільні“. Тая-ж газэта піша, што ў часе суботніх масавых вобыскаў у Вільні, якія таксама пачаліся з беларускіх культурных установаў, — „на жаль, 150 обыскаў далі **толькі 60 затрыманых асоб**, якія адданы дзеля сьледзтва судовай уладзе“. „Камуністы былі, відаць, прыгатаваныя“.

Калі ўсе, у каго рабілі вобыскі, былі такімі-ж „камуністамі“, як Беларуская Кнігарня, ці другія беларускія культурнікі, дык ім і „прыгатаўляцца“ нечага было! Дарэмна была „праца“ ахранкі!

Замахі на цягнікі. 6 красавіка між Годуцішкамі і Лынтупамі на рэльсы перад пасажырскім цягнікам былі пакладзены тэлеграфныя слупы. Машыніст сваячасна ўгледзіў небясьпеку.

9 красавіка тое-ж самае здарылася на чыгунцы між Глыбокім і Каралеўшчынай. Машыніст таксама сваячасна затрымаў цягнік.

„Беларуска-украінская канфэрэнцыя“ ў Вільні. Некалькі дзён таму назад галава „казённых беларусаў“, „доктар“ Павлюкевіч, ня маючы мандату нават ад „сваей“ Часовай Рады, езьдзіў на канфэрэнцыю да галавы „казённых украінцаў“ п. Оскілкі. Пэўна-ж, п. Оскілка не пашкадаваў выдаткаў (на рахунак п. львоўскага ваяводы!), каб добра і шчыра, па старапольску, угасьціць маючага, здаецца, добры апэтыт і заўсёдную смагу п. Павлюкевіча... Дык ці-ж бы той меў астацца ў даўгу перад п. Оскілкай і не запрасіць — на гэткую-ж самую „канфэрэнцыю“ (балазе, таксама на „казённы“ кошт!)—галаву украінскіх наймітаў да Вільні?!

Вось у гэтым тыдні, як пішуць газэты, і мае адбыцца ў Вільні (ў „Брыстолі“ ці ў „Зацішу“?) украінска-беларуская „канфэрэнцыя“ „украінскай народнай партыі“ і „Тымчасовай (пакуль плоцяць пэнсію...) Беларускай Рады“. Канфэрэнцыя мае цягнуцца 3—4 дні...

Асабліва ўрачыста абвясьцілі аб гэтым „важным“ здарэньні, ведама, польскія эндэцкія газэты...

Зямная нагрода манаху. Міністар „рэлігіяў“ п. Ст. Грабскі (найзаядлейшы польскі нацыяналіст і каталіцкі клерыкал), падараваў—коштам скарбу—быламу рэктару Віленскай Праваслаўнай Сэмінары archim. Filip'у тысячу злотых—у нагроду—„за заслугі перад айчызнай (п. Ст. Грабскага?).

Здаецца, толькі адзін arch. Filip з усяго праваслаўнага духавенства на „Крэсах“ атрымаў гэткую адзнаку асаблівай, калі не пашаны (бо хто-ж шануе таго, каму за „заслугі“ можна заплаціць грашмі?!), дык — удзячнасьці з боку сучаснага польскага ўраду Тугутта-Грабскіх. Галоўная-ж „заслуга“ arch. Filipa, ня кажучы аб драбнейшых,—ведамы ўсім: гэта—пададзены ім, як рэктарам Сэмінарыі, праект увядзеньня ў яе польскага языка, як выкладовага.

Дык можна сказаць, што 1000 злотых на'т—ня дорага... У кожным разе—цікава і характэрна для нашых часоў гэтая цынічная грашавая „нагрода“—на жыцьцёвы камфорт—**манаху**, які прысягаў, здаецца, шукаць скарбу не „на зямлі, але на небе?...

ГРАМАДЗЯНЕ! Усё яшчэ сярод нашых падпішчыкаў—многа неакуратных даўжнікоў!

Памятайце, што газэта—гэта вашая агульная ўласнасьць, якая істнуе за складаную вамі падпіску! Дык кожын, хто адчувае патрэбу чытаць родную сваю газэту, хай памятае і свой абавязак перад ёй!

Прысылайце акуратна падпіску! Намаўляйце да гэтага суседзяў і знаёмых!

Каму не пад сілу падпісацца на газэту аднаму,—падпісвайцеся ўскладчыну!

Карэспандэнцыі.

Хто загарадзіў нам шлях да ператварэньня польск. школы ў беларускую.

(*с. Гарадзілава, Ашмянскага пав.*).

Ня ўсё і там добра, гдзе і маўчаць. Ня лепш і нам жылося, чым і нашым братом, але мы маўчалі і цярпелі, сколькі маглі. Цяпер маўчаць стала і нам немагчыма, бо ўзяло за жывое, біцьцё і насьмешка роўна баліць: як ад першага баліць цела, так ад другога баліць сэрца. А над намі наш п. войт гм. Палачанскае, м. Леган з сваім сэкрэтаром стварылі насьмешку, але, апроч насьмешкі, яшчэ вялікую крыўду, бо яны гэтым загарадзілі нам шлях да таго, каб вучыць нашых дзяцей у роднай мове. Сколькі разоў ад 6 сакавіка да 20-га мы прасілі свайго войта сьцьвердзіць нашы ўласныя подпісы на дэклярацыях аб жаданьні беларускае школы, але войт ні сёе ні тое, от, абы час марнаваць, толькі адно адказ, што яшчэ ня мае ад старосты такіх распаражэньняў, „як будзе прыслана (казаў войт), тагды сьцьверджу“. Мы яму і гаварылі. Чакалі мы яму ад 8 да 20 сакавіка. 21—22/III пацягнуліся мы да гміны наконта гэтае справы, але войта дома не засталі. Думалася, што яшчэ пасьпеем зацьвердзіць, але выйшла іначай. Як сталі мы цягацца да войта, дык аж агоркла, але яго ўсё ня было дома, негдзе ўсё езьдзіў, аж 26 сакавіка яго мы засталі ў гміне, гдзе і смаліцай прысталі, каб сьцьвердзіць дэклярацыі. Праўда, стаў сьцьвярджаць, і сьцьвердзіў 5 подпісаў, а болей—хоць лопні! Як рук яму ні цалавалі,—ні за што. Галава, кажа, баліць (а відаць с пахмельлем) і часу няма, заўтра прыдзіце. Пайшлі на другі дзень, а яго і з сьвечкай не знайсьці; так на трэці і чацьверты, і нічога не зрабілі, цяпер, значыцца, усё нашае мусіць прапала. Але войт няхай не спадзяецца, што прапала, бо мы знойдзем другі шлях да гэтага.

Гарадзілавец.

Змаганьне за родную школу.

Перасьцярога!

У вёску Астравы, Куранецкай гміны, Вялейскага павету прыбыў вывядовец (шпік) да грам. Мікалая Ляха і заявіў, што ён дэлегаваны ад Беларускага Пасольскага Клюбу, каб памагчы другому грамадзяніну Аляксею Ляху ў працы па складаньню інспэктару дэклярацыяў аб жаданьні беларускай школы.

Сяляне адразу зразумелі, што гэта быў „воўк у авечай шкуры“, які зусім ня мог гаварыць пабеларуску.

Затым ён зьявіўся да солтыса в. Журыхі тэй самай гміны і запрапанаваў бацьком запоўніць застаўшыяся дэклярацыі, засьведчыць подпісы ў гміне без самых жа дэклярантаў і падаць школьнаму інспэктару; казаў, што, калі ён сам усе гэта зробіць, то з восені напэўна адчыніцца беларуская школа ў в. Журыхі. Нашчасьце яму удалося абмануць толькі трох бацькоў.

ГРАМАДЗЯНЕ! Не падавайцеся абмаву, ня верце падобным людзям, паступайце, як кажа інструкцыя Цэнтр. Бел. Шк. Рады; аб тых ці іншых надужыцьцях, запужваньнях і іншых перашкодах паведамляйце Ц. Б. Ш. Р.

Да ведама дэклярантаў.

Школьны інспэктар Нясьвіжскага павету два разы адмовіўся прыняць ад паўнамоцніка в. Група, Сноўскай гм. падпісаныя і пасьведчаныя гмінаю дэклярацыі аб жаданьні беларускай мовы пасьля 31 сакавіка, кажучы, што яшчэ няма распараджэньня прымаць, хоць тэрмін і прадоўжан да 21 красавіка. Паўнамоцнік паслаў дэклярацыі па пошце.

Рэдак. Гэтым даводзіцца да ведама грамадзянства, што на падставе распараджэньня Мін. Рэліг. Спраў і Асьветы ад 7. І. 1925 г. § 9 можна ўнасіць у працягу цэлага школьнага году.

Лепей позна, чым ніколі.

(З *Косаўшчыны*).

У дзень 400-летняга Скарынінскага Юбілею мы бачылі многа розных прывітаньняў Бел. Навук. Т-ву, адно пасярод гэтых прывітаньняў ня было сардэчнага прывітаньня ад нашае многа-пакутнае Косаўшчыны. Ня было афіцыяльнага, але было неафіцыяльнае. Гэтае прывітаньне сялян Косаўшчыны выявілася ў дружным змаганьні за сваю родную беларускую школу. Так, напрыклад, сяляне кожнае вёскі, там, дзе ёсьць сёньня польскія школы, бяз вынятку падалі дэклярацыі аб ператварэньні ў чыста беларускія.—Гэта ў Косаўскай гміне. Такім парадкам ніводнага мейсца не засталося дзеля польскае школы ў Косаўскай гміне.

Вёскі, падаўшыя дэклярацыі з жаданьнем беларускае школы: Косаў на 60 дзяцей, Булагрыўда, Карошча, Дубітова, Галік, М. Галік, Мілейкі, Заполе і г. д.

Форма прыгавараў дала на Косаўс. павет 7 жаданьняў (згодна Б. Ц. Ш. Р.), а форма дэклярацыяў для аднае Косаўс. гміны— жаданьне сялян для 15-цёх беларускіх школ!!!

Гэтак вітаюць нашыя сяляне 400-тыя ўгодкі закладзінаў Скарынай друкарні ў Вільні.

Будземо спадзявацца, што гэтак сама прывітаець кожная гміна Скарынінскі юбілей, як прывітала яго Косаўская!

За ўсіх: **Мікалай Птушка.**

Рэдактар-Выдавец **Антон Пракапеня.**

Друкарня **Н. Левін і Сын**, Вільня, Нямецкая 22